УДК 93/94(930)

# КРЫНІЦЫ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ Ў ВЫВУЧЭННІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Т. В. Кедрык**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
г. Мінск, Беларусь

Вусныя сведчанні відавочцаў падзей Вялікай Айчыннай вайны пачалі збіраць ужо з 1942 г., калі пачала працу Надзвычайная дзяржаўная камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых. Задачай працы Камісіі быў «поўны ўлік злачынстваў нацыстаў і нанесенай імі шкоды савецкім грамадзянам і сацыялістычнай дзяржаве» [1]. Збор інфармацыі ажыццяўляўся з мэтай падліку маштабаў стратаў і выкарыстання сведчанняў пацярпелых у судовых працэсах над ваеннымі злачынцамі. Сабраныя сведчанні не сталі самастойнымі гістарычнымі крыніцамі і ў большай ступені засталіся ілюстратыўным матэрыялам для дэманстрацыі злачынстваў нацызму.

Пасля вайны некаторы час збор успамінаў працягваўся. Важную ролю ў гэтым адыгралі пісьменнікі К. Сіманаў, А. Бек, С. Смірноў і іншыя. Але ў цэлым цікавасць да вусных крыніц знізілася. У Савецкім Саюзе фармаваўся кананічны вобраз вайны як «вялікай Перамогі» і любыя трактоўкі падзей, што не працавалі на такі вобраз, апынуліся непрымальнымі. Актыўны збор вусных крыніц спыніўся: рэгулярна запісваліся толькі ўспаміны выдатных дзеячаў дзяржавы і культуры. Таму, хоць асобныя аўтары і выкарыстоўвалі вусныя крыніцы, але ў большасці выпадкаў даследчыкі імкнуліся па магчымасці не афішаваць зварот да практыкі вуснай гісторыі. Больш за тое, як і іншыя крыніцы асабістага паходжання, вусныя звесткі звычайна не змяшчаліся ў спецыялізаваныя архіўныя сховішчы.

У 1970–1980 гг. журналісты і пісьменнікі зноў звяртаюцца да збору вусных успамінаў сведак падзей. З аднаго боку, гэта было звязана з развіццём гуказапісваючай тэхнікі, якая давала магчымасць фіксацыі і далейшай апрацоўкі інтэрв’ю. А з другога боку, гістарычная дыстанцыя, якая стала аддзяляць сведак часу ад перажытых падзей, стварала новыя ўмовы для асэнсавання вопыту і ўбудоўвання яго ва ўласную біяграфію.

Станаўленне вуснай гісторыі як накірунку гістарычных даследаванняў на постсавецкай прасторы пачынаецца ў 1990 гг. Першапачаткова даследчыкі, якія выкарыстоўвалі ў сваіх працах метады інтэрв’ю, ставілі мэтай перш за ўсё пошук фактаў, не адлюстраваных у вядомых пісьмовых дакументах і гістарыяграфіі. Тэмы, якія раней па ідэалагічных прычынах не былі даследаваны, так званыя «белыя плямы» гісторыі, пачынаюць вывучацца перш за ўсё праз вуснагістарычныя крыніцы. У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны такімі тэмамі былі жыццё пад акупацыяй, лёсы остарбайтараў, ваеннапалонных, Халакост, узаемаадносіны партызан і мясцовага насельніцтва. Менавіта вусныя крыніцы, з аднаго боку, «далі голас» групам, якія мелі падобны вопыт вайны,

які не быў уключаны ў афіцыйны наратыў. З другога боку, ўспаміны сведак падзей, сабраныя, захаваныя і апрацаваныя з дапамогай вуснагістарычных методык, узбагацілі базу гістарычных крыніц для даследчыкаў. Суб’ектывізм вусных апавяданняў перастаў быць недахопам гэтага віду крыніц, стаўшы адметнасцю і перавагай. Менавіта складаны працэс пастаяннага асэнсавання і пераасэнсавання лёсу асобы ў кантэксце гісторыі ўсяго грамадства знаходзіцца ў цэнтры даследчыцкай увагі вусных гісторыкаў.

Паколькі пакаленне непасрэдных сведак і ўдзельнікаў вайны паступова сыходзіць, перад даследчыкамі стаіць задача задакументаваць і захаваць як мага больш сведчанняў і ўспамінаў. Са з’яўленнем і распаўсюджваннем інтэрнэту з’явілася мноства праектаў, звязаных з вуснай гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш значнымі з’яўляюцца праекты анлайн-сховішчаў і архіваў, дзе сабраныя ўспаміны захоўваюцца, сістэматызуюцца і апрацоўваюцца. Сярод падобных праектаў варта назваць праект Гістарычнай майстэрні ім. Л. Левіна з Мінску [2], якая займаецца захаваннем памяці аб Мінскім гета і лагеры Трасцянец, у тым ліку і праз стварэнне віртуальнага архіва сведак падзей. Другім вартым увагі анлайн-архівам з’яўляецца Беларускі архіў вуснай гісторыі (БАВГ) [3], які не толькі захоўвае, але і арганізуе экспедыцыі па збору ўспамінаў, а таксама прымае на захаванне калекцыі, сабраныя беларускімі гісторыкамі. Хоць БАВГ працуе не толькі з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, у ім захоўваюцца тэматычныя калекцыі, прысвечаныя остарбайтарам і вязням Мінскага гета.

Такім чынам, вуснагістарычныя крыніцы вывучэння дазваляюць па-іншаму паглядзець на пэўныя аспекты гісторыі, адкрываюць чалавечае вымярэнне вайны, дзе досвед звычайнага чалавека мае важнае значэнне і ўзбагачае наша разуменне і асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Материалы Чрезвычайной государственной комиссии по расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков [Электронный ресурс] / Государственный архив Российской Федерации. – Режим доступа: http://statearchive.ru/1185. – Дата доступа: 13.04.2020.

2. Архив свидетелей Минской исторической мастерской [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zeitzeugenarchiv.gwminsk.com/ru/archiv. – Дата доступа: 13.04.2020.

3. Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.nashapamiac.org/archive/archivetree.html. – Дата доступа: 13.04.2020.